*У наступным годзе ў краіне шырока адзначаць 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У вераснёўскім нумары нашага часопіса мы расказалі пра тое, з чаго ўсё пачыналася: пра фарсіраванне Дняпра і вызваленне першага беларускага райцэнтра Камарына.*
*Маем намер надалей асвятляць малавядомыя старонкі бітвы за Беларусь. Пабываем у мясцінах, дзе разгортваліся лёсавызначальныя падзеі, паслухаем успаміны відавочцаў. Разам з ваеннымі гісторыкамі і экспертамі паспрабуем разабрацца ў перыпетыях вызваленчай кампаніі восені 1943-га – лета 1944 года.*

# След у сэрцы

## Былы настаўнік з глухой вёсачкі на Гомельшчыне стварыў унікальны музей, каб захаваць памяць пра вайну

**Млявы паўнаводны Сож купаецца ў ласкавых промнях бабінага лета. Ля берага нерухома застыў човен. Наваколле патанае ў звонкай і празрыстай цішыні некранутай прыроды. Здаецца, кожная клетачка цела ўдзячна ўспрымае неверагодны спакой, гармонію і нетаропкасць, што пануюць наўкола. Адчуванне, быццам трапіў у зусім іншы свет – немітуслівa-нязвыклы і такі прыцягальны… Але дзе гэта? Сож, ён вялікі, а мы ў вёсцы Паштовая Глінка, што за кіламетраў 25 ад райцэнтра Карма.**

### «Як тут бухала на Сожцы!»

– Пойдзем, пойдзем далей, – цягне нас за сабой па ледзь заўважнай лясной сцежцы, што сцелецца ўздоўж пакручастага берага Сожа, няўрымслівы Аляксей Васільевіч Сцепаненка. Яму 65, былы настаўнік гісторыі, краязнаўца, адзін з усяго трох жыхароў Паштовай Глінкі. Больш у гэтай вёсцы на мяжы з Магілёўскай вобласцю ніхто не жыве. Усё праз Чарнобыль: Паштовая Глінка ў атачэнні адселеных тэрыторый. Але радыёактыўныя ападкі выпалі нераўнамерна і сталася так, што тут чыстая «пляма», вёска і бліжэйшае наваколле не забруджаны радыяцыяй. І ўсё ж гэта, відаць, слабое суцяшэнне для тых, хто хацеў бы прыехаць сюды на сталае жыхарства.



– Налева Слаўгарадскі раён, направа Краснапольскі, – узмахвае рукой Аляксей Васільевіч. – Напрасткі лічаныя кіламетры, але прабірацца такім чынам цяпер ужо складана, зарасло ўсё.

Злева ад сцежкі, па якой мы ідзём уздоўж Сожа, бясконца цягнецца нейкая старая траншэя з бугарком-насыпам. Час замаскіраваў яе мохам і хмызняком, маладымі дрэўцамі, і цяпер яна выглядае як амаль натуральны элемент рэльефу.

*«Сож быў чырвоны ад крыві, целы савецкіх салдат плылі па цячэнні».*

– Нямецкія акопы, – пацвярджае маю здагадку Сцепаненка. – Тут, на правым беразе Сожа, у Паштовай Глінцы, была лінія варожай абароны. А нашы наступалі з левага… Зараз выйдзем на высотку, пабачыце, адкуль.

Маляўнічы краявід, што неўзабаве адкрываецца з высокага і стромкага берага, уражвае настолькі, што ажно дух захоплівае. Недзе далёка ўнізе вальяжна плешчацца Сож. Спрабую ўявіць, як у лістападзе 1943-га фарсіравалі раку ў ледзяной вадзе байцы Чырвонай арміі, як ішлі ў атаку на нямецкую ў чатыры эшалоны абарону. І не магу, не паддаецца асэнсаванню.

– Перадавыя часці 362-й стралковай дывізіі 3-й арміі генерала Аляксандра Гарбатава, якая вызваляла Гомель, былі ўжо на левым беразе першага кастрычніка. Стаялі досыць доўга, – расказвае Аляксей Васільевіч. – Сож фарсіравалі 22 лістапада. Але нашы байцы спрабавалі 12 і 16 кастрычніка пераправіцца цераз раку. Тым самым хацелі ўвесці ворага ў зман, каб немцы частку сваіх сіл з-пад Гомеля адправілі сюды. Так яно і здарылася: вораг абарону абласнога цэнтра аслабіў, але тут паляглі тысячы, Сож быў чырвоны ад крыві, целы савецкіх салдат плылі па цячэнні. Пра гэта, дарэчы, пісалі Канстанцін Ракасоўскі і Аляксандр Гарбатаў у сваіх успамінах.

Былы настаўнік цяжка ўздыхае, і, гледзячы на процілеглы бераг, адкуль у 1943-м наступалі нашы войскі, доўга маўчыць. Я разумею, чаму. Для яго падзеі 80-гадовай даўніны і ўвогуле вайна – гэта тое, што выпакутавана доўгімі гадамі пошукавай

**Камандуючы 3-й ударнай арміі генерал-палкоўнік Аляксандр Гарбатаў. 1943 год**



**Сапёры фарсіруюць Сож. Восень 1943 года**



працы, бяссоннымі начамі за пісьмовым сталом. Тое, што прайшло праз сэрца і даўно стала нечым вельмі асабістым.

– Паштовая Глінка ўся згарэла падчас вайны, з сотні дамоў толькі адзін застаўся, – працягвае свой сумны расказ Аляксей Васільевіч. – Мясцовыя жыхары, якія пасля вызвалення вярнуліся ў родную вёску, ад убачанага жахнуліся.

У суседнім Казімірове жыве 101-гадовая Ніна Яўменаўна Кузняцова, яна якраз з Паштовай Глінкі. Пад акупацыяй «умудрылася выскачыць замуж у Драгатынь, пяць кіламетраў адсюль». У Паштовай Глінцы, у самым пекле, засталася маці.

***«Нам жа аб'явілі: ухадзіце, будзе вялікае наступленне, ідзіце ў лес».***



**101-гадовая Ніна Яўменаўна Кузняцова з вёскі Казімірова Кармянскага раёна**

– Ой, госпадзі, як адагналі ўжо іх (немцаў. – *Аўт.*), я прыбегла ў гэту Глінку з Драгатыні, – нягледзячы на шаноўны ўзрост, жанчына памятае ўсё да драбніц. – Перарыта вёска. Баюся, бо замініравана ўсё. Яны стаялі ладна тут, акапаліся. Падушкі, пасцелі павынеслі ў акопы свае. І маму кудысьці выгналі, а жывая яна ці не. Во прыбегла, паплакала ды пайшла.

Ідылія бабінага лета ніяк не суадносіцца ў свядомасці з тым, пра што нам расказвае, седзячы на лаўцы пад старой бярозай ля сваёй хаты, Ніна Яўменаўна.

– Нам жа аб'явілі: ухадзіце, будзе бальшое наступленне, ідзіце ў лес. І мы пайшлі ўначы туды, – жанчына цярэбіць ражок прыгожай хусткі. – Кароўка была, забралі і яе. І ў лесе знаходзіліся два тыдні. Нада ж там нешта з'есці, галлё збіралі ды агонь клалі. Чуем, ляціць самалёт. Вадой адразу заліваем. Во было – гаравалі, не дай Бог.

Той самы дзень чакалі, як манну нябесную. І чаканне гэта здавалася невыносным, бо паратунак быў зусім побач, на другім беразе.

– Як тут бухала на Сожцы! Колькі людзей пабіла! – хітае галавой старая. – Былі ў людзей валы. Не коні, а валы. Дык прама на дарозе немцы забілі і сына, і бацьку, і вала тога. Во як было.

Мне нават трохі няёмка, што чапляю чалавека за жывое, бо бачу, як цяжка Ніне Яўменаўне ўспамінаць ваеннае ліхалецце.

– Ой, ой… Забег салдат наш у хату. Хлеба просіць, – на шчацэ ў жанчыны ці то слязінка, ці то серабрыстая павуцінка. – Знімае з сябе сапагі. Я кажу: «Дзетачка, родненькі, не трэба мне твае сапагі, нічога». Што было на стале, аддала яму ў рукі – ідзі ў сваіх сапажочках. А салдаты тады ішлі па вуліцы, песні пелі.

Жанчына расказвае, што яе «хазяін», муж Міхаіл, «з год быў у партызанах, а потым (пасля вызвалення. – *Аўт.*) іх ужо забралі на фронт, пайшоў на вайну». Партызанаў вяскоўцы падтрымлівалі як маглі.

– Кожны выносіў ім, – гаворыць Ніна Яўменаўна. – Я баялася, дык свёкар быў: «Татачка, кажу, хадзі ты, я баюся адна». Гарлачык малака прыгатуеш ім, хлеба якога, яечак дасі. Паблагадарыць – пойдуць. Усё па ласцы. Сілай ніколі нічога не забіралі. Не, не, не…

Найбольшым жахам акупацыі былі «чарапкі» – эсэсаўцы, якія раптоўна маглі наляцець на вёску, і тады нікому не было літасці: ні старым, ні дзецям. Як толькі людзі заўважалі, што карнікі едуць ці з

суседняй вёскі прыбягалі, каб папярэдзіць пра небяспеку, уцякалі ў лес.

«Хазяін» Ніны Яўменаўны, на шчасце, героем вярнуўся з вайны. З Драгатыні сям'я неўзабаве пераехала ў Казімірова, бо «там бедна было, пяскі, не радзіла нічога, а тут прадсядацель кажа: „Будуйцеся!"». Як жылі ў пасляваенныя гады? Жанчына гаворыць, што гэта доўгая песня, не надта вясёлая. Лёгка не было, усяго хапала ў жыцці.

*«Дзетачка, родненькі, не трэба мне твае сапагі, нічога».*

Міхаіл Васільевіч памёр у 1983 годзе. Пахаваны на могілках у Глінцы. А ёй «боженька пасля вайны даў столькі пажыць». У Ніны Яўменаўны чацвёра дзяцей, а «ўнукаў і праўнукаў хто яго знае, пятнаццаць будзе ўсіх». Здаровае пачуццё гумару, калі табе за сто, дарагога каштуе!

– Ай, нашто вы з мяне фатаграфію робіце?! – спахопліваецца раптам Ніна Яўменаўна, заўважыўшы, што ля яе завіхаецца наш фотакарэспандэнт. Ведала б ты, дарагая бабулечка, наколькі важнае для нас кожнае тваё слоўца, твая бясхітрасная праўда пра вайну.

## «Каб не рвалася нітка памяці...»

Ва ўспамінах генерала арміі Аляксандра Гарбатава «Гады́ і войны» ёсць цікавы і нават забаўны эпізод. У ім легендарны камандарм згадвае, як увосень 1943-га вызвалялі Прапойск – такую, зусім не мілагучную назву меў да 1945 года Слаўгарад.

Быў трэці дзень наступлення, а значыць, нашы войскі, фарсіраваўшы Сож, ужо выгналі фашыстаў з Паштовай Глінкі і шэрагу іншых населеных пунктаў. Да Прапойска (Слаўгарада) заставаўся нейкі дзясятак кіламетраў. Дакладаючы Гарбатаву пра аператыўную абстаноўку, камандзір 362-й дывізіі генерал Васіль Далматаў, чытаем у мемуарах, «паставіў незвычайную ўмову: „Горад Прапойск не ўваходзіць у паласу нашай арміі, але мы можам ім авалодаць пры ўмове, што вы не будзеце ўзбуджаць хадайніцтва аб прысваенні дывізіі назвы Прапойская". Вядома, я яму гэта абяцаў, і ў трынаццаць гадзін таго ж дня дывізія авалодала горадам Прапойск».

– Як бы цяжка ні было на вайне, але без гумару не абыходзілася, часам гэта ратавала жыцці, – па-філасофску заўважае Аляксей Васільевіч Сцепаненка. Мы ідзём па адзінай вуліцы ў Паштовай Глінцы – Цэнтральнай. Зарослая высокай травой дарога вядзе наўпрост да Сожа, па ёй зрэдку прабіраюцца машыны рыбакоў ды грыбнікоў, для якіх тут, ва ўладарстве амаль некранутай прыроды, сапраўдны рай.

– Там нічога такога асаблівага, – у каторы раз былы настаўнік гісторыі «рыхтуе» мяне, сталічнага госця, да сустрэчы з тым, што неўзабаве ўбачым.

– Але ж гэта справа, як кажуць, усяго жыцця, хіба не так? – парырую.

Аляксей Васільевіч моўчкі пагаджаецца.



Сціплая хатка ля Сожа стала месцам прыцягнення для многіх людзей



У лёсах удоў ёсць нешта біблейскае, лічыць Аляксей Сцепаненка

На маляўнічым ускрайку лесу прытулілася звычайная вясковая хата. Ці дакладней – хацінка, улічваючы памер. Яе пасля вайны на папялішчы пабудавала ўдава Марыя Старавойтава разам з чатырма малалетнімі дзецьмі. У 2012 годзе пустую старую будыніну – без вокнаў, столі і паловы даху – павінны былі знесці, але Сцепаненка не даў. Рабочыя намерваліся выклікаць міліцыю. Урэшце канфлікт дайшоў да колішняга старшыні Кармянскага райвыканкама Івана Анатольевіча Навуменкі, і ён сустрэўся з няўрымслівым былым настаўнікам.

– Мяне кранула ідэя, з якой прыйшоў Аляксей Васільевіч, – расказвае Іван Навуменка, цяпер ён узначальвае СК «Лагойскі» РУП «Беларуснафта-Мінскаблнафтапрадукт». – Сказаў, што добра ведаў працавітую гаспадыню гэтай хаты і хацеў бы ажыццявіць сваю даўнюю мару – стварыць музей удоў вайны – менавіта тут, каб захаваць атмасферу. Пагадзіцеся, неардынарны падыход да важнай справы – захавання памяці. Мае бацькі шмат расказвалі мне пра вайну і хацелася, каб у першую чаргу моладзь магла ўвачавідкі ўбачыць і адчуць сэрцам гістарычную праўду, задумацца, што значаць сённяшнія цяжкасці ў параўнанні з перажытым нашымі папярэднікамі.

Хатку да ладу Аляксей Васільевіч даводзіў разам з аднадумцамі. І вось ужо дзесяць гадоў тут жыве Памяць – пра подзвіг жанчын, якія засталіся без мужоў і, нягледзячы на неймаверныя цяжкасці пасляваеннага жыцця, вырасцілі цэлае пакаленне людзей.

Музей гэта ці не? Напэўна, так, хоць ініцыятыва Сцепаненкі не набыла афіцыйнага статусу. Хтосьці скажа: памятнае месца ці мемарыяльная экспазіцыя і таксама, відаць, будзе мець рацыю. Але ці ў найменні справа? «Быў у пяці музеях, прысвечаных Вялікай Айчыннай. Але зразумеў вайну толькі тут» – такі запіс пакінуў адзін з наведвальнікаў.

Чаму менавіта ўдовы? На гэта пытанне Аляксей Сцепаненка адказвае проста: гэта ўсё ў ягоным сэрцы. У Паштовай Глінцы былы настаўнік гісторыі жыве з 1998 года, а родам з вёскі Кабылічы (цяпер Дубравіна) Кармянскага раёна. З дзяцінства знаходзіўся сярод удоў вайны, многіх ведаў асабіста.

– Для мяне вельмі важна перадаць іх подзвіг, пра што мы амаль не расказваем, – гаворыць Аляксей Васільевіч. – Якія трагічныя іх лёсы! Вось Зінаіда Старчанка, ведаў гэту жанчыну, маці 11 дзяцей. Чацвёра сыноў загінулі на фронце. Прыйшлі таксама

пахаванкі на мужа і двух братоў. Яна часта маўчала, ніколі не ўсміхалася.

З заміраннем сэрца адчыняем дзверы ў незвычайную хатку. Адразу трапляем у малюсенькія сенцы. Аляксей Васільевіч паказвае аб'ёмную кнігу. Яна дасталася яму ад роднага дзядзькі, які збіраў разнастайны матэрыял пра гэтыя мясціны і людзей, што жылі тут. Цяпер яе папаўняе Сцепаненка.

– Шмат каштоўных запісаў было і ў мяне, але здалі на макулатуру, – са шкадаваннем вымаўляе ён. – А хто? Доўгая песня.

*«Разам гнілі ў акопах, разам ляжаць у магіле. Можа, яны нас наставяць на розум».*

Над уваходам у святліцу тры партрэты – Ганны Плоскай з Чарнігаўскай вобласці Украіны, Матроны Фяськовай з Клінцоўскага раёна Бранскай вобласці Расіі і Веры Перасавай з Беларусі. Іх мужы загінулі ў баях за вызваленне Кармянскага раёна і пахаваны ў адной магіле ў вёсцы Хляўно. Ганна Плоская, маці пяцярых дзяцей, доўга безвынікова шукала свайго, пошукі бацькі працягнула дачка Марыя. Знайсці апошні след на зямлі роднага чалавека дапамог Сцепаненка.

– Разам гнілі ў акопах, разам ляжаць у магіле. Можа, яны нас наставяць на розум, – уздыхнуўшы гаворыць Аляксей Васільевіч, ідавочна, маючы на ўвазе падзеі апошняга часу.

З экспазіцыі Сцепаненкі можна даведацца пра лёсы недзе пяцідзесяці ўдоў Вялікай Айчыннай вайны. Ёсць інфармацыя пра загінулых землякоў-франтавікоў. На адным з фотаздымкаў – Фёдар Пратасенка. За дапамогу партызанам фашысцкія нелюдзі закапалі яго жывым. Непадалёк заўважаю ручнік. Яго падарыла музею сям'я ўдавы Ганны Кандзюховай з вёскі Крамянкі Слаўгарадскага раёна, якая зусім побач з Паштовай Глінкай. Экспанат унікальны, як і гісторыя, што з ім звязана. Увосень 1943-га перад фарсіраваннем Сожа ў хату да Кандзюховай пастукаўся наш салдат. Сказаў, што ў яго замерзлі ногі. Што рабіць, чым дапамагчы, жанчына не ведала: ніякай матэрыі ў яе не было, сама ў лапцях, на руках малое дзіцё. І тады, перажагнаўшыся, зняла ручнік з абраза і са словамі «Госпадзі, даруй мне» аддала яго байцу Чырвонай арміі.

Дзіўнае пачуццё: чым даўжэй знаходзімся ў хацінцы, тым усё больш недзе ў падсвядомасці нараджаецца адчуванне ўласнай датычнасці да людскіх лёсаў, міжволі пачынаеш суперажываць.

**Кожны элемент экспазіцыі – гэта чыйсьці лёс ці гісторыя**






Канешне, гэта заслуга Аляксея Васільевіча: расказчык ён выдатны, а кожны фотаздымак ці прадмет незвычайнай экспазіцыі – часцінка і ягонага жыцця, яго клопату, і гэту шчырасць немагчыма не адчуць. Але не толькі. Тут сапраўды жыве душа вялікіх працаўніц, памяць пра вайну праз лёсы ўдоў, якія выратавалі цэлае пакаленне. Іх мацярынская і грамадзянская самаадданасць, на думку Сцепаненкі, нароўні з подзвігам франтавікоў.

– Заўсёды слухаў, што расказваюць сваім маўчаннем удовы, – задумліва прамаўляе Аляксей Васільевіч. – Усім, хто прыязджае сюды, звычайна кажу: якія б цяжкасці ў жыцці ні ўзніклі, перадолець іх дапамогуць успаміны пра подзвіг удоў вайны.

Насамрэч, як я зразумеў, Паштовая Глінка хіба толькі вонкава выглядае як нейкая запаведная мясціна. Апроч рыбакоў-грыбнікоў, у вёску часцяком наведваюцца менавіта дзеля музейнай хаткі. То моладзь на веласіпедах з Кармы ці са Слаўгарада, то бацькі дзяцей прывязуць. Краснапольскія школьнікі сюды выпраўляюцца па Сожы на байдарках. Да гэтых сустрэч Сцепаненка ловіць рыбу (яе тут багата) і робіць таранку, якая потым разыходзіцца як прызы за правільныя адказы ў віктарыне, якую ён ладзіць. Дзеці ў захапленні ад такога спасціжэння гісторыі роднага краю, асабліва ваеннага часу – непасрэдна на месцы даўніх падзей, з цікавым і нераўнадушным чалавекам.

***«Заўсёды слухаў, што расказваюць сваім маўчаннем удовы».***

Няўрымслівы Сцепаненка арганізаваў міжнародную сустрэчу «Мы былі ў адным акопе» і правёў яе… у акопе на левым беразе Сожа, адкуль увосень 1943-га наступалі нашы. Пабывалі ў яго ветэраны і моладзь з Клінцоў Бранскай вобласці. А пра візіт дэлегацыі з Тульскай вобласці нагадвае печ, якая ратуе сцены хацінкі-музея ад сырасці, – падарунак губернатара Аляксея Дзюміна. Летась у Паштовую Глінку ажно з Ханты-Мансійскай аўтаномнай акругі на рэтрааўтамабілях «Победа» завіталі ўдзельнікі экспедыцыі «Перамога – у нашых сэрцах». Было пра што пагаварыць у акопах, ля брацкіх магіл і месцах фарсіравання Сожа, у старой хаце ўдавы Марыі Старавойтавай.



**Аляксей Васільевіч Сцепаненка**

– Дзеля чаго гэты клопат? – мне падаецца, у нейкім неўразуменні перапытвае Сцепаненка. – Каб не рвалася нітка памяці… Пакуль хаджу, буду займацца. Мой след тут.

Да яго часам звяртаюцца з просьбай дапамагчы ў пошуках, асабліва з суседняй краіны – больш як палова палеглых тут у баях за вызваленне Беларусі, паводле звестак краязнаўца, выхадцы з Расіі. Альбо дасылаюць фотаздымкі ўдоў, спадзеючыся, што для іх таксама знойдзецца месца ў экспазіцыі. Не заўсёды гэта магчыма праз недахоп сродкаў: экспазіцыю Сцепаненка рыхтуе за ўласныя грошы, часам дапамагаюць сваякі. А яшчэ Кармянскі раённы савет ветэранаў, у склад якога ўваходзіць Аляксей Васільевіч, яго падтрымлівае як можа.

– У мяне некалькі месцаў сілы. Там, дзе стаіць гэта хацінка, адно з іх, – гаворыць вядомы гісторык, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Ігар Марзалюк. – Быццам нічога такога асаблівага, а чапляе здорава. Я туды часта езджу, мне там падабаецца. З высоткі праз рэчку бачу ўвесь свой Краснапольскі раён (Краснаполле – малая радзіма Марзалюка. – *Аўт.*).

Ігар Аляксандравіч расказвае, што пазнаёміліся яны колькі гадоў таму, можна сказаць, выпадкова: краязнаўца звярнуўся да яго з лістом па гістарычную кансультацыю. А потым дэпутат пабываў у Паштовай Глінцы і быў уражаны ўбачаным і пачутым.

*«У мяне некалькі месцаў сілы. Там, дзе стаіць гэта хацінка, адно з іх».*

– Ён вельмі цікавы, чалавек з няпростым лёсам, некалькі разоў быў на мяжы жыцця і смерці, – расказвае Марзалюк пра Сцепаненку. – У яго свая сістэма вартасцяў. Такі тыповы ў добрым сэнсе гэтага слова савецкі настаўнік.

На думку дэпутата і вучонага-гісторыка, справа, якой займаецца былы настаўнік, жывая, ідзе з глыбіні душы. Так і павінна быць, калі хочам захаваць гістарычную памяць, выхаваць патрыётаў – сапраўдных, дзейсных, а не такіх, што ўмеюць толькі прыгожа разважаць аб адданасці Радзіме.

– Тое, што ён робіць, не лухта нейкая, даруйце мне. Гэта жывое. Так і трэба гаварыць з жывымі пра мёртвых, якія ў нашай памяці заўсёды павінны быць жывыя. Я так бы сказаў, – як заўсёды, Марзалюк пераканаўчы.

## Замест эпілога

З хаты выйшлі ўражаныя. Прыселі са Сцепаненкам на лаўку – трэба супыніцца, неяк пераварыць усё. Добра прытуліцца да цёплых пад вераснёўскім сонцам сцен, адчуць чароўную моц старога дрэва. Сядзім, маўчым. Першым не вытрымліваю я:

– Аляксей Васільевіч, можна яшчэ адно пытанне?

Сцепаненка зацікаўлена глядзіць на мяне. Вытрымліваю паўзу.

– Чаму ваша вёска называецца так – Паштовая Глінка?

– А я ўжо напалохаўся: пра што яшчэ спытаеце? – смяецца Аляксей Васільевіч. – Глінка была то ў складзе ВКЛ, то Рэчы Паспалітай, то Расійскай імперыі. Кацярына II загадала пабудаваць паштовы тракт Санкт-Пецярбург – Кіеў. Як ён тады працаваў? 16–20 кіламетраў – і коней на спецыяльных станцыях мянялі. На тэрыторыі Магілёўскай губерні было 19 паштовых станцый. Глінка – адна з іх. Станцыя знаходзілася непадалёк ад дома, дзе я жыву. Чаму лічу, што тут? Бо толькі на гэтым месцы знаходзяць манеты. Самая старая, якую бачыў, 1811 года.

Да нас падбягае чорненькі віславухі шчанюк і пачынае лашчыцца да гаспадара. Аляксей Васільевіч бярэ яго на рукі, той аж вішчыць ад задавальнення, з усіх сіл намагаючыся лізнуць твар.

І я раптам разумею, што бачу перад сабой шчаслівага чалавека, які знайшоў сваю жыццёвую дарогу і ўпэўнена крочыць па ёй, робячы тое, што вельмі патрэбна ўсім нам.

*Ігар ГАНЧАРУК*
*Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, з архіва БЕЛТА і адкрытых крыніц*
*Мінск – Паштовая Глінка – Мінск*